## *ХРОНІКА*

# ПАМЯЦІ ВЫДАТНАГА САВЕЦКАГА ГІСТОРЫКА

Яго імя назаўсёды ўвайшло ў гісторыю савецкай навукі і культуры. Таленавіты савецкі гісторык-славіст, першы рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта, першы заслужаны прафесар Беларускай ССР, адзін з заснавальнікаў Інстытута беларускай культуры, Акадэміі навук БССР і Інстытута славяназнаўства АН СССР, першы загадчык кафедры паўднёвых і заходніх славян Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта, адзін з першых беларускіх акадэмікаў, правадзейны член Акадэміі навук СССР Уладзімір Іванавіч Пічэта па праву з'яўляецца гонарам не толькі беларускай, але і ўсёй савецкай гістарычнай навукі.

Іменна гэтым можна растлумачыць тую велізарную цікавасць, якую праявілі вучоныя краіны да III навуковых чытанняў, прысвечаных памяці акадэміка У. І. Пічэты. Яны праходзілі 24—25 кастрычніка 1984 г. у Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна і былі арганізаваны Інстытутам славяназнаўства і балканістыкі АН СССР, кафедрай гісторыі паўднёвых і заходніх славян Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава, Інстытутам гісторыі АН БССР і гістарычным факультэтам Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Пленарнае пасяджэнне праходзіла ў аўдыторыі, якая носіць яго імя. Чытанні ўступным словам адкрыў рэктар БДУ, акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі. Ён адзначыў вялікую ролю, якую адыграў Уладзімір Іванавіч у стварэнні Беларускага універсітэта, даў высокую ацэнку яго працы на пасадзе рэктара і прафесара БДУ ў 1921—1930 гг.

Удзельнікі чытанняў з вялікай цікавасцю заслухалі даклад на тэму «Стан і перспектывы гістарычных даследаванняў па славяназнаўству і балканістыцы», які падрыхтаваў загадчык сектара гістарыяграфіі і навуковай інфармацыі Інстытута славяназнаўства і балканістыкі АН СССР, доктар гістарычных навук У. А. Дзякаў. Увагу ўдзельнікаў пленарнага пасяджэння прыцягнуў даклад загадчыка кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян МДУ, доктара гістарычных навук, прафесара В. Р. Карасёва і навуковага супрацоўніка МДУ Л. І. Уткінай на тэму «У. І. Пічэта і Маскоўскі універсітэт». Яны адзначылі: «Які б аспект навучальнага працэсу і навуковай дзейнасці кафедры мы б ні ўзялі сягоння, можна лёгка пераканацца ў тым, што вытокі, асновы ўсяго былі закладзены У. І. Пічэтай, яе заснавальнікам і першым кіраўніком. Дастаткова назваць такія навуковыя праблемы, як утварэнне славянскіх дзяржаў, славяна-германскія і славяна-рускія адносіны і сувязі, гісторыя славяназнаўства, крыніцазнаўства, гістарыяграфія і многія іншыя».

«У. І. Пічэта і Беларускі дзяржаўны універсітэт» — тэма даклада доктара гістарычных навук, прафесара БДУ Д. Б. Мельцара. На яркіх, цікавых фактах ён паказаў ролю Уладзіміра Іванавіча ў стварэнні і паспяховай дзейнасці БДУ. Дакладчык падкрэсліў, што адным з самых важных этапаў у жыцці У. І. Пічэты быў яго ўдзел у арганізацыі Беларускага універсітэта і станаўленні беларускай савецкай гістарычнай навукі. Васьмігадовая праца Уладзіміра Іванавіча на пасадзе рэктара і дзевяціцігадовая дзейнасць у якасці прафесара БДУ пакінулі глыбокі след у развіцці беларускай навукі і культуры, вышэйшай адукацыі і асветы ў рэспубліцы.

Старшы навуковы супрацоўнік Інстытута славяназнаўства і балканістыкі АН СССР Г. Э. Санчук выступіў на пленарным пасяджэнні з дакладам «У. І. Пічэта і арганізацыя Інстытута славяназнаўства». Ён адзначыў, што Пічэта прыняў непасрэдны ўдзел у арганізацыі Інстытута славяназнаўства АН СССР: на аснове яго паведамлення аб задачах славістычных даследаванняў у чэрвені 1945 г. было прынята рашэнне хадайнічаць аб арганізацыі інстытута. У. І. Пічэта сфармуляваў задачы новага інстытута ў галіне гістарычных славістычных даследаванняў, лічачы першачарговым вывучэнне асноўных сацыяльна-эканамічных працэсаў і заканамернасцей у гісторыі замежных славянскіх краін, вывучэнне гісторыі сувязей народаў СССР з замежнымі славянскімі народамі, даследаванне гісторыі фарміравання нацыянальнай самасвядомасці славян, распрацоўку праблемы этнагенезу. Уладзімір Іванавіч стаў арганізатарам і аўтарам першых выданняў інстытута, навуковым кіраўніком маладых гісторыкаў-славістаў.

Аб росце цікавасці да навуковай спадчыны акадэміка У. І. Пічэты ў апошнія гады сведчыць той факт, што калі на першых і другіх навуковых чытаннях памяці акадэміка У. І. Пічэты працавала толькі адна секцыя, то на трэціх даклады і паведамленні размеркаваліся па пяці секцыях: «Навуковая творчасць У. І. Пічэты», «Пытанні гістарыяграфіі», «Усеагульная гісто-

рыя», «Гісторыя СССР» і «Гісторыя БССР».

«У. І. Пічэта і праблемы гісторыі паўднёвых славян у сярэднія вякі» — тэма выступлення дацэнта БДУ Л. П. Сушкевіч. Яна адзначыла, што сярод ранніх работ Пічэты, якія адлюстроўваюць гісторыю паўднёваславянскіх народаў, асобае значэнне маюць работы «Гістарычны лёс Сербіі» і «Эканамічная гісторыя Сербіі». Апошняя работа з'явілася першай у рускай славістыцы спробай даць спецыяльную распрацоўку праблем сацыяльна-эканамічнага развіцця сербскіх зямель у сярэдневякоўе.

З выключнай цікавасцю было заслухана паведамленне на тэму «Акадэмік У. І. Пічэта—гісторык Айчыннай вайны 1812 года», з якім выступіў доктар гістарычных навук, намеснік старшыні праблемнага савета па гісторыі гістарычнай навукі ў СССР У. А. Дунаеўскі. Ён падкрэсліў, што працы У. І. Пічэты па гісторыі Вялікага княства Літоўскага, Беларусі, паўднёвых і заходніх славян сталі класічнымі. Але як вучоны самага шырокага навуковага дыяпазону, ён звяртаўся і да вывучэння іншых аспектаў сусветнай гісторыі, сярод якіх рад праблем, звязаных з вывучэннем гісторыі Расіі. Адна з іх — Айчынная вайна 1812 года. Пічэта падкрэслівае велізарнае ваенна-палітычнае значэнне барацьбы літоўскіх і беларускіх сялян супраць памешчыкаў і атрадаў напалеонаўскай арміі. Выклікае цікавасць і меркаванне Пічэты аб тым, што пераход сялян да актыўнай барацьбы з захопнікамі адбыўся стыхійна, без якога-небудзь націску са зне.

Рад невядомых і малавядомых матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці У. І. Пічэты надалі асобую каштоўнасць выступленню старшага навуковага супрацоўніка Інстытута славяназнаўства і балканістыкі АН СССР А. М. Гараінава «У. І. Пічэта і вывучэнне ў СССР некаторых пытанняў гісторыі славяназнаўства (1920—1940 гг.)».

Частка дакладаў і паведамленняў была прысвечана даследаванням У. І. Пічэты па гісторыі Беларусі, яго ўкладу ў развіццё беларускай савецкай навукі і культуры. Дацэнт БДУ М. Ф. Піліпенка у сваім выступленні на тэму «У. І. Пічэта аб паходжанні беларускага народа» прааналізаваў даследаванні вучонага па гэтай праблеме, даказаў, што большасць з іх не страціла сваёй навуковай каштоўнасці да цяперашняга часу. Гэта асабліва датычыцца артыкула Пічэты «Утварэнне беларускага народа».

Глыбінёй зместу і дакладнасцю вывадаў адзначаўся даклад старшага навуковага супрацоўніка Інстытута славяназнаўства і балканістыкі АН СССР А. І. Рогава на тэму «Навуковая творчасць У. І. Пічэты і задачы вывучэння беларускай культуры эпохі Сярэдневякоўя і Адраджэння». Ён падкрэсліў, што ўвагу Пічэты прыцягвала перш за ўсё гісторыя сярэдневяковай культуры і асабліва праблема беларускага Адраджэння. Але вучонага цікавіў таксама і рад іншых пытанняў: барацьба народа супраць насільнага акаталічвання і паланізацыі і развіццё нацыянальнай самасвядомасці, культурныя сувязі Беларусі з іншымі краінамі, дзейнасць выхадцаў з Расіі ў Беларусі і некаторыя іншыя аспекты гісторыі беларускай культуры. Як адзначыў дакладчык, даўно наспела неабходнасць стварэння комплекснай навуковай працы па гісторыі беларускай сярэдневяковай культуры, якая б ахапіла ўсе яе бакі: літаратуру, філасофскую думку, мастацтва, архітэктуру. Такая праца дазволіла б больш паспяхова вырашыць рад пытанняў, якія застаюцца нявысветленымі. Гэта праца дазволіла б больш поўна ацаніць уклад беларускага народа ў сусветную культуру.

«Крытыка палітыкі Ватыкана і каталіцкай царквы ў Беларусі ў працах У. І. Пічэты 1939—1941 гг.» — тэма даклада доктара гістарычных навук, прафесара, загадчыка кафедры гісторыі БССР Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта Я. Н. Мараша. Дакладчык адзначыў, што, нягледзячы на асобныя недахопы, працы У. І. Пічэты адыгралі важную ролю ў барацьбе супраць антынавуковых канцэпцый гісторыі Беларусі, у развенчванні буржуазна-клерыкальных вымыслаў аб прагрэсіўнай ролі каталіцызму і уніяцтва ў гістарычным лёсе беларускага і ўкраінскага народаў, садзейнічалі ўмацаванню дружбы народаў Савецкай краіны, патрыятычнаму і інтэрнацыянальнаму выхаванню маладога пакалення.

Дацэнт Мінскага педінстытута імя А. М. Горкага Э. Р. Іофе выступіў з паведамленнем на тэму «У. І. Пічэта і праблема запрыгоньвання беларускага сялянства ў савецкай гістарыяграфіі». Праблема запрыгоньвання сялянства Беларусі знайшла асвятленне ў работах Б. Д. Грэкава, Д. Л. Пахілевіча, Л. С. Абецадарскага, Ю. М. Юргініса, А. П. Грыцкевіча, В. І. Мялешкі, М. Ф. Спірыдонава і іншых савецкіх гісторыкаў. На думку Э. Р. Іофе, большасць даследаванняў пацвярджаюць вывады У. І. Пічэты аб сувязі запрыгоньвання сялянства Беларусі з развіццём феадальнай зямельнай уласнасці, гандлю, паншчыны, а таксама аб класавым характары палітыкі шляхты ў адносінах да сялянства.

«У. І. Пічэта аб землекарыстанні сялян Беларусі (XVI ст.)» — тэма выступлення аспіранта Інстытута гісторыі АН БССР В. Ф. Голубева. Аналізуючы погляды У. І. Пічэты па дадзенаму пытанню, дакладчык адзначыў вялікі ўклад вучонага ў распрацоўку аграрнай гісторыі Беларусі феадальнай эпохі.

Загадчык кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін БДУ Э. М. Загарульскі пазнаёміў удзельнікаў чытанняў з археалагічнымі даследаваннямі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Вялікую цікавасць выклікалі звесткі аб старажытным Мінску.

Рад дакладаў і паведамленняў зрабілі вучоныя Украіны. Загадчык кафедры гістарыяграфіі Данецкага дзяржаўнага універсітэта дацэнт В. А. Пірко ў дакладзе «Праблемы аграрнай гісторыі Украіны ў працах У. І. Пічэты» падкрэсліў, што вывады вучонага аб асноўных напрамках аграрных адносін на тэрыторыі Украіны ў перыяд позняга феадалізму з'явіліся адпраўным пунктам для далейшых даследаванняў.

На заключным пасяджэнні высокую

ацэнку атрымалі даклады Г. Э. Санчука «Гісторыя Вялікай Маравіі ў замежнай і савецкай гістарыяграфіі пасляваеннага часу», Л. В. Забароўскага «Праблемы руска-польскіх знешнепалітычных адносін XVII ст. (1619—1699 гг.) у савецкай гістарыяграфіі», Ю. І. Драгуна «Беларуска-польскія культурныя сувязі другой палавіны XIX ст. (гістарычныя погляды А. Кіркора)», І. І. Лешчылоўскай «Праблемы фарміравання нацыянальных культур славянскіх народаў у навейшых савецкіх даследаваннях», Д. Ф. Паплыкі «Праблемы развіцця грамадскай думкі паўднёвых славян XIX ст. у савецкай гістарыяграфіі», А. В. Крапівіна «Сучасная гістарыяграфія аб стварэнні Балгарскага земляробчага народнага саюза».

На заключным пасяджэнні III навуковых чытанняў памяці акадэміка У. І. Пічэты ўдзельнікі падзякавалі дэкану гістарычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна прафесару І. В. Царук і прафесару Д. Б. Мельцару за добрую іх арганізацыю. На гэтым пасяджэнні быў выбраны арганізацыйны камітэт IV навуковых чытанняў памяці акадэміка У. І. Пічэты на чале з прафесарам МДУ В. Р. Карасёвым. Было прынята рашэнне правесці іх у 1988 г. у Маскоўскім дзяржаўным універсітэце імя М. В. Ламаносава.

*Э. Р. ІОФЕ*

ИЗВЕСТИЯ АКАДЕМИИ НАУК БССР № 2
серия общественных наук
Тэхнічны рэдактар С. А. Курган

Здадзена ў набор 01.02.85. Падпісана ў друк 17.04.85. АТ 06035. Фармат 70×108¹/₁₆. Высокі друк. Ум. друк. арк. 11,20. Ум. фарб.-адб. 11,72. Ул. выд. арк. 12,0. Тыраж 645 экз. Зак. № 212.

Выдавецтва «Навука і тэхніка» Акадэміі навук БССР і Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600. Мінск, Ленінскі праспект, 68. Друкарня імя Францыска (Георгія) Скарыны выдавецтва «Навука і тэхніка». 220600. Мінск, Ленінскі праспект, 68.